Древности Белоруссии. Минск, 1966; Железный век Средней Белоруссии (VII—VI вв. до н.э. — VIII в. н.э.). Минск, 1978; Археологические памятники восточных балтов на территории Белоруссии в эпоху железа (VIII в. до н.э. — IX в. н.э.) // Из древнейшей истории балтских народов: (по данным археологии и антропологии). Рига, 1980. *В.І.Шадыра.*

**МІФ** (ад грэч. mythos казанне, паданне), сістэма старажытных поглядаў і ўяўленняў аб Сусвеце і чалавеку; апавяданне з фантаст. падзеямі, вобразамі багоў, легендарных герояў. Першабытнаму мысленню ўласцівы недакладнае раздзяленне суб'екта і аб'екта, матэрыяльнага і ідэальнага, адзінага і множнага, статычнага і дынамічнага, прасторавых і часавых адносін. Асаблівасці міфал. мыслення тлумачацца тым, што стараж. чалавек не вылучаў сябе з навакольнага асяроддзя, надзяляў яго чалавечымі здольнасцямі і пачуццямі. Ачалавечванне прыроднага асяроддзя праявілася ва ўсеагульнай персаналізацыі, вераваннях, такіх, як *анімізм*, *татэмізм*, *фетышызм*. Асн. рысы М. і міфал. свядомасці — антрапамарфізм (надзяленне прыродных аб'ектаў чалавечымі ўласцівасцямі), зоамарфізм (уяўленне багоў у вобразе жывёл), сінкрэтызм (непадзельнасць з'явы і сутнасці, прадмета і яго назвы), сімвалізм (замена адных прадметаў і з'яў на інш. без страты асаблівасцей першых), генетызм (вызначэнне сутнасці прадмета праз яго паходжанне), этыялагізм (выкарыстанне аповеда пра паходжанне прадмета або з'явы для вызначэння яго сутнасці), амбівалентнасць (супярэчлівасць, дваістасць, напр., богі то дапамагаюць, то шкодзяць). Вылучаюць М. тэаганічныя (пра багоў), касмаганічныя (пра ўзнікненне Сусвету), этыялагічныя (пра паходжанне і ўласцівасці аб'ектаў і з'яў прыроды), антрапагенічныя (пра паходжанне чалавека), этнагенічныя (пра паходжанне народаў). У наш час міфал. ўяўленні праяўляюцца ў рытуалах, абрадах, прыкметах, павер'ях. Гл. таксама *Міфалогія.*

*Літ.*: Міфы Бацькаўшчыны. Мінск, 1994; Міфалагічныя ўяўленні беларусаў. Мінск, 2010; Мифы Беларуси: справочник-определитель. Минск, 2014.
*А.М.Аляхновіч.*

**МІФАЛАГІЗМ**, выкарыстанне вядомых міфалагічных сюжэтаў, матываў, вобразаў у тэматыцы маст. твора; увасабляецца ў тэксце адкрыта, прама, звычайна для надання сімвалічнага сэнсу (эксплІцытна) або апасродкавана, ускосна (імпліцытна), часам нават незалежна ад творчай волі аўтара. Так, відавочная сакралізацыя сонца прысутнічае ў шматлікіх творах Я.Коласа і яго паслядоўнікаў, супрацьстаянне хаосу і космасу — у ранніх паэмах Я.Купалы, ваен. раманах К.Чорнага і асабліва ў сучасных творах постмадэрнізму. М. мае дачыненне не да ўнутрыэпахальнай канкрэтыкі, а да ўніверсальных катэгорый і канцэптаў, якія застаюцца актуальнымі на працягу ўсёй гісторыі сусв. л-ры, паколькі з'яўляюцца анталагічнымі. М. можна заўважыць практычна ў кожным значным маст. творы, таму што ні адзін з іх не абыходзіцца без бінарных апазіцый (напр., час і прастора як асн. фізічныя параметры свету), пэўных архетыпаў, якія вызначаюць сутнасць псіхічнага жыцця чалавека, найб. каштоўнай часткі яго асабістага і калектыўнага вопыту, закладзенага ў генах, рытуалізаваных праяўленняў (фіксацыі каляндарных змен у прыродзе, ініцыяцыі моладзі, шлюбу як саюзу індывідуумаў і інш.). Пад М. таксама разумеюць матыў ці сукупнасць матываў, суаднесеных з міфапаэт. сэнсамі — архетыпамі (напр. верх — ніз, маці, кроў), маральна-этычнымі нормамі, формамі маст. асэнсавання свету, у цэлым фундаментальнымі асновамі быцця, ацэненымі чалавецтвам як адвечныя ў працэсе развіцця цывілізацыі. Паняцце «М.» неабходна адносіць менавіта да тэматыкі, змястоўнага плана таго ці іншага твора, а не да прыёмаў, не да фармальных яго асаблівасцей.

*Літ.*: Каваленка В.А. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры. Мінск, 1981; Шамякіна Т.І. Славянская мифология. Минск, 2005; Я е ж. Міфалогія і беларуская літаратура. Мінск, 2008. *Т.І.Шамякіна.*

**МІФАЛАГІЧНАЯ ШКÓЛА** ў фалькл оры, кірунак беларускай фалькларыстыкі 2-й пал. 19 ст. **Філас.** асновай для М.ш. стала эстэтыка ням. рамантыкаў Ф.Шэлінга і братоў А. і Ф.Шлегеляў, у працах якіх *міфалогія* вызначана як крыніца і «ядро» сусв. мастацтва. Прадстаўнікі М.ш. лічылі крыніцай л-ры *міф* і шукалі яго праявы ў вуснапаэт. творчасці народаў свету. Бел. М.ш. фарміравалася пад уплывам ідэй рускай М.ш. (Ф.І.Буслаеў, П.А.Бяссонаў, А.М.Афанасьеў). Айчынных даследчыкаў асабліва цікавілі тыя віды і жанры фальклору, дзе найб. выразна адбіліся рысы стараж. уяўленняў. З сярэдзіны 1840-х гг. з пазіцый М.ш. ў перыядычным друку актыўна выступаў П.М.Шпілеўскі («Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе павер'ях», 1853—56). Ён адзначыў добрую захаванасць у бел. фальклоры рэшткаў стараж. вераванняў, даў апісанні мясц. паданняў, вясельных абрадаў, радзін, хрэсьбін, пахаванняў і памінак, у т.л. адпаведныя песні і галашэнні, а таксама каляндарных абрадаў і звычаяў (калядныя, веснавыя, жніўныя), прывёў прыклады нар. забабонаў. У цыкле артыкулаў «Падарожжа па Палессі і Беларускім краі» (1853—55) апісаў быт бел. сялян, паказаў Беларусь як самабытны слав. край з надзвычай багатай вусна-паэт. творчасцю. З пазіцый М.ш. напісаны і артыкул А.Кіркора «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» (1854), прысвечаны сямейным і каляндарным абрадам, звычаям, нар. святам, а таксама паданням і легендам пра курганы, камяні, бел. прыказкам і прымаўкам. Метадалогія М.ш. аказала істотны ўплыў на фалькларыстычную дзейнасць П.В.Шэйна, які распрацаваў уласную праграму па збіранні фалькл. і этнаграф. матэрыялаў, накіраваную

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на пошук «спрадвечных звычаяў, абрадавага боку жыцця ў яго характэрных момантах, рэштках самабытнай творчасці». Некаторых пазіцый М.ш. прытрымліваліся М.Я.Нікіфароўскі, Е.Р.Раманаў, Я.А.Ляцкі і інш. Прадстаўнікі М.ш. сабралі і даследавалі вял. вусна-паэт. спадчыну бел. народа, заклалі аснову параўнальнага вывучэння міфалогіі, фальклору і л-ры, звярнулі ўвагу на бел. фальклор даследчыкаў па-за межамі краіны. Іх дзейнасць садзейнічала актыўнаму вывучэнню нар. творчасці, узняла пытанні тэарэтычных праблем вывучэння бел. вусна-паэт. твораў у кантэксце агульнаславянскага, еўрап. і нават сусв. фальклору.

*Літ.:* Пятроўская Г.А., Цішчанка І.К., Васілевіч У.А. Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне нар. творчасці ў 60-х гг. XIX — пач. XX ст. Мінск, 1989; Кабашнікаў К.П., Фядосік А.С. Гістарыяграфія беларускай фалькларыстыкі // Беларусы. Т. 7. Вусная паэтычная творчасць. Мінск, 2004; Шпилевский П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. Минск, 2004; Яго ж. Беларусь у абрадах і казках. Мінск, 2010. *А.У.Марозаў.*

**МІФАЛАГІЧНЫ ЖАНР**, жанр жывапісу, літаратуры, іншых відаў мастацтва, дзе асновай тэматыкі, сюжэта і фармальных асаблівасцей твора з'яўляецца матыў вядомага *міфа* ці яго часткі. Творам М.ж. звычайна ўласцівы сімвалічнасць вобразаў (багоў, герояў, духаў і інш.), семантычная ўмоўнасць, своеасаблівая трансфармацыя прасторы і часу, ілюстратыўная апавядальнасць раскрыцця зместу міфа. Ужываць паняцце М.ж. у дачыненні да мастацтва першабытнага грамадства і антычнасці неправамоцна, бо міфал. прынцып свядомасці дамінаваў ва ўсёй тагачаснай маст. культуры, з'яўляўся татальнай ідэалагічнай і эстэтычнай канцэпцыяй. Як жанр сфарміраваўся ў эпоху Адраджэння (С.Батычэлі), да М.ж. звярталіся творцы стыляў класіцызму (М.Пусэн), рамантызму (прарафаэліты), сімвалізму канца 19 — пач. 20 ст. (О.Бёрдслей, М.Рэрых, А.Муха). У Беларусі ў 18 ст. М.ж. распрацоўвалі мастакі В.Ваньковіч, Я.Дамель, К.Рыпінскі, у 19 — пач. 20 ст. — Г.Дмахоўскі, Я.Драздовіч, Ю.Пэн. У канцы 20 ст. ў бел. выяўл. мастацтве найб. яскравымі прадстаўнікамі М.ж. былі Г.Вашчанка, А.Ісачоў, М.Селяшчук. У сучасным бел. мастацтве ў М.ж. працуюць А.Зіменка, А.Марачкін, В.Слаук, С.Цімохаў і інш.

У л-ры М.ж. праяўляецца ў свядомым выкарыстанні пісьменнікам сюжэта вядомага міфа, змястоўнай ці структурнай яго часткі, наяўнасцю ў творы пэўных міфалагем і міфем, з яскрава выяўленым ім цэласным, сінтэтычным, анімістычным мысленнем, характэрным для нашых продкаў — стваральнікаў міфалогіі і фальклору (творы Я.Купалы, М.Багдановіча). М.ж. — своеасаблівае светаадчуванне народнай у сваёй аснове філасофіі. У літ.-знаўстве замест паняцця М.ж. больш мэтазгодна ўжываць тэрмін *міфалагізм*.

*Літ.:* Шамякіна Т.І. Міфалогія Беларусі. Мінск, 2000; Яе ж. Беларуская класічная літаратура і міфалогія. Мінск, 2001; Яе ж. Міфалогія і беларуская літаратура. Мінск, 2008.

*Т.І.Шамякіна.*

**МІФАЛАГІЧНЫЯ ВОБРАЗЫ** ў фальклоры. Ствараюцца пры трансфармаванні ў пэўных гіст. умовах *міфалогіі*, якая, страчваючы сваю містычную прыроду і адначасова разбураючы ўласную структуру, пры гэтым набывае эстэтычны сэнс. М.в. і матывы садзейнічаюць выяўленню глыбінных нац. вытокаў маст. творчасці, а таксама праз універсальныя вобразы, агульныя тэмы і інш. спрыяюць аб'яднанню народаў. Фалькларызацыя пэўных з'яў адбываецца і ў наш час (напр., метэаралагічныя працэсы прымаюцца за з'яўленне неапазнанага лятаючага аб'екта), што абумоўлена міфал. свядомасцю. Усё часцей поспехі на шляху развіцця цывілізацыі звязваюць з наведваннем Зямлі іншапланетнікамі, падарожнікамі з будучага (хранаўтамі) ці людзьмі з паралельнай прасторы. Набываюць папулярнасць эсхаталагічныя міфы. Фалькларызацыя з'яў рэальнасці з адначасовым выкарыстаннем змястоўных і фармальна-структурных рыс *міфа* з'яўляецца глыбока арганічнай уласцівасцю чалавечага мозгу ў яго здольнасці да творчага пераасэнсавання жыцця. Так, *анімізм* стаў асновай метафарызацыі мовы, паэт. паралелізму ў фальклоры як яго базіснага прынцыпу, а таксама персаніфікацыі прыродных з'яў і тропікі, якая, у сваю чаргу, перайшла з фальклору ў маст. л-ру. Татэмістычныя ўяўленні, якія, як і анімізм, вызначаюць сутнасць міфал. мыслення, шырока выявіліся ў казках пра жывёл, у генезісе некаторых фалькл. персанажаў (Івашка — Мядзведжае Вушка), у вобразах памочнікаў гал. казачнага героя, у надзвычай пашыраным матыве пярэваратніцтва (вобраз Усяслава Чарадзея). Міфал. мадэль свету ў найб. ступені адлюстравана ў *замовах*, чарадзейных казках. Касмічныя аб'екты (Сонца, Месяц, зоркі) шырока прадстаўлены ў песнях, загадках, казках. Былыя космаўтваральнікі (Баба-Яга, Кашчэй, Цмок) сталі персанажамі многіх чарадзейных казак як пасрэднікі (медыятары) паміж рэальным светам і іншасветам і з часам набылі выключна негатыўны сэнс. Уласна фальклор, як і міфалогія, таксама занатоўвае і своеасабліва тлумачыць жыццё, але робіць гэта выключна ў эстэтычнай форме і не прэтэндуе на прызнанне яго фантаст. вобразаў за рэальнасць, што характэрна для міфа. Да нашага часу працэс пераходу міфалогіі ў фальклор, які дазваляе рэстаўрыраваць міфал. сістэму пэўнага народа ў яе цэласнасці, высветлены недастаткова. У канцы 20 — пач. 21 ст. бел. навукоўцамі распрацаваны некалькі структурна арганізаваных сістэм вывучэння гэтага працэсу (А.І.Зайцаў, А.М.Ненадавец, А.Я.Хатэнка і інш.).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ